**АГУЛЬНАЎЖЫВА́ЛЬНАЯ ЛЕ́КСІКА**, словы, якія шырока выкарыстоўваюцца ў штодзённых моўных зносінах (у вусным і пісьмовым маўленні) без усякіх абмежаванняў; найважнейшая частка слоўнікавага складу беларускай мовы. З'яўляецца ядром лексічнай сістэмы, неабмежавана пранікае ва ўсе стылі мовы, утварае базу для ўсіх колькасных і якасных пераразмеркаванняў у моўнай сістэме.

Ужыванне А.л. не залежыць ад месца жыхарства, прафесіі, узросту, роду заняткаў, адукацыйнага і культурнага ўзроўняў, сацыяльнага становішча людзей, не абмежавана моўнай сітуацыяй (стылем, жанрам, формай мовы): *горад*, *дом*, *аргумент*, *настальгія*, *жыта*, *вялікі*, *добры*, *есці*, *гатаваць*, *моцна*, *хто*, *яны*, *перад*, *але*, *ах*, *гэй* і інш.

*Н.П. Лобань.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ